# Майстэрства суцяшэння

**Айчыннае мастацтва, прынамсі, жывапіс, не аднойчы папракалі ў залішнім апяванні прыроды. Сапраўды, часам яно здаецца бяздумным, не нясе ў сабе аніякай ідэі ці нават пачуцця. Асабліва гэта відавочна па серыях — у тых выпадках, калі аўтар знайшоў ці скарыстаў пэўнае рашэнне і жадае адлюстраваць тэму, але спрацоўвае гэта толькі ў некалькіх работах; астатняе атрымліваецца другасным, незапамінальным, бляклым. Адзін з нямногіх мастакоў, каму ўдаецца працаваць у традыцыйным жанры і заставацца цікавым гледачу і арт-крытыкам, — жывапісец Антон Вырва. Яго персанальная выстаўка «Свабодная прастора» ў галерэі «Арт-Фабрыка» — нагода для разважанняў.**

«Краявіды беларускага мастака Антона Вырвы — рэдкі вялікі скарб вобразаў прыроды, прасякнутых глыбокім пачуццём — любові да навакольнага асяроддзя. Выявы, у якіх пасялілася сапраўдная гісторыя нават у самай простай і штодзённай задуме. Аўтар стварае той сапраўды рэальны пейзаж, у якім вольна «дыхае» кранальнае, простае пачуццё прыроды ў свабоднай прасторы», — так заяўляюць арганізатары пра персанальную выстаўку ў «Арт-Фабрыцы».

Пейзаж як роздум аб прыгажосці і як адлюстраванне адметнасці наваколля, як выяўленне пачуццяў чалавека і як дэманстрацыя вобраза краіны і яе народа — можна па-рознаму падыходзіць да работ Антона Вырвы. Адно дакладна: прырода на яго палотнах шматгранная ў сваёй прыгажосці. Мастак умее перадаць нават самае неспрыяльнае надвор'е так, што глядач зачаруецца. Некалькі дзясяткаў карцін на выстаўцы «Свабодная прастора» — як доказ таго, што такі несучасны жанр, як рэалістычна-лірычны пейзаж, адназначна не губляе папулярнасці. Загадка для многіх хаваецца, мабыць, у жыццесцвярджальнай сіле палотнаў Антона Вырвы. Бывае, чалавеку проста неабходна пачуць заспакаяльнае «Усё будзе добра, усё атрамаецца. Прыйдзе новы дзень, і выгляне сонца. І шлях твой будзе працягвацца…» Мастак дорыць гэтую надзею, веру ў добрае. Многія карціны напоўнены промнямі вясновага святла, чаканай цеплынёй. Матыў абуджэння гучыць упэўнена і гучна і адначасова пранікнёна. Карціны яго не пацерпяць таропкасці, недаверу, няўважлівасці.


*«Паводка», 2023 г.*

Святло, празрыстасць, далікатнасць работ нагадваюць пра найлепшыя ўзоры рускіх і беларускіх жывапісцаў мінулага стагоддзя — усё ж у сучасным айчынным жывапісе пераважаюць іншыя каларыстычныя рашэнні, адрозная вобразнасць. Гаворка, апроч іншага, пра крыніцы натхнення, магчымыя, хоць часам і відавочныя (творчасць Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Віталя Цвіркі). Пейзажы Антона Вырвы пераканаўча беларускія, у іх пазнаюцца наша сціплая прырода, ваколіцы вёсак і гарадоў. На палотнах можна ўбачыць аграгарадкі Іказнь і Ракаў, абласныя цэнтры Віцебск і Гродна, іншыя неназваныя мястэчкі. Аднак мастак не адмаўляецца ад красы далёкіх ад Беларусі мясцін. Вядома, сапраўдны творца не цураецца так званага «чужога».


*«Згасае дзень», 2018 г.*


*«Снежань», 2020 г.*

Персанальная выстаўка Антона Вырвы ў «Арт-Фабрыцы» безумоўна ўдалая. Усцешылі логіка пабудовы экспазіцыі, падыходы да інтэгравання карцін у выставачную прастору, маштабнасць прадстаўлення творчасці жывапісца. Несумненна, апошнія работы жывапісца, якія раней не дэманстраваліся, заслугоўваюць высокай ацэнкі. Аднак мімаволі нараджаюцца непрыемныя пытанні… А што пасля? Мастак і надалей будзе разважаць аб паэзіі розных станаў прыроды? Працягне прытрымлівацца камернасці і лірызму? Зноў звернецца да ў нечым простых і сціплых матываў? Яго імкненне выявіць адчуванне адзінства з прыродай і родным краем не адыдзе на другі план і не заменіцца чымсьці іншым? Хто ведае… Відавочна ж тое, што майстэрства Антона Вырвы здольна яшчэ неаднойчы захапіць, а створанае — суцешыць.

Пейзажы выстаўкі «Свабодная прастора» ў галерэі «Арт-Фабрыка» можна ўбачыць да 6 снежня.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

# Вокамгненне праз уражанне

**Мастацкая спадчына жывапісца, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Барыса Аракчэева надзвычай багатая, як і ў многіх тагачасных аўтараў. Стваралі шмат — быў і дзяржзаказ, былі розныя нагоды для эксперыментаў, было шмат працы ў стол… Сёння палотны могуць гадамі пыліцца ў сховішчах і бог ведае калі паказацца шырокай публіцы. Гэта калі няма папулярызатараў творчасці таго ці іншага мастака. Аднак здараецца, такія знаходзяцца — як правіла, гэта члены сям'і, якія таксама звязалі сваё жыццё з мастацтвам. Напрыклад, работы бацькі Пятра Шарыпы часта прэзентуе дачка Алена Пятроўна. Папулярызацыяй жа спадчыны Барыса Уладзіміравіча займаецца адна з яго дачок Аксана Барысаўна.**

Нядаўна пры яе актыўным удзеле была арганізавана выстаўка «Малая радзіма ў творчасці беларускіх мастакоў» у Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна. Няхай экспазіцыя атрымалася сціплай, як і наогул многія бібліятэчныя, але гэта ўсё адно важная частка справы ўвекавечання памяці мастака, папулярызацыі яго спадчыны. Між тым гэта не проста выстаўка выбраных, далёка не самых знакамітых работ майстра (гуаш, акварэль) — у праект увайшлі творы маладой мастачкі Дар'і Цітовай.


*Барыс Аракчэеў «Бярэзіна сухаходная», 1976 г.*

Дар'я Цітова нарадзілася ў 1999 годзе ў горадзе Калінкавічы. У 2014—2018 гадах вучылася ў Гомельскім дзяржаўным мастацкім каледжы (спецыяльнасць — «Жывапіс»). У 2022-м скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (спецыяльнасць — «Выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка»). Між тым з 2018 года мастачка працуе настаўніцай выяўленчага мастацтва ў Дудзіцкай дзіцячай школе мастацтваў (Гомельская вобл., Калінкавіцкі р-н, аграгарадок Дудзічы). Паспела паўдзельнічаць у некалькіх выстаўках у Беларусі і за мяжой. Сярод іх — Міжнародная выстаўка плакатаў, прысвечаных рэгі, у Ліверпулі (2017) і выстаўка-продаж «Асенні салон» (2022). У 2019-м была арганізавана персанальная выстаўка жывапісу Дар'і Цітовай «Малахітавая шкатулка» ў Калінкавіцкім краязнаўчым музеі. У такой колькасці работы аўтара ў Мінску экспануюцца ўпершыню.

Творы аўтараў пасуюць адзін аднаму. Пяшчотнасць колераў, мяккасць пераходаў, багацце адценняў яднаюць работы, як і выразнасць адлюстраванага, яснасць кампазіцыі. Аднак у Барыса Аракчэева адлюстравана мінулае стагоддзе — пейзажы Яраслаўшчыны і вёскі Турбанава, у якой мастак нарадзіўся і жыў да свайго пераезду ў Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. У цэнтры ўвагі Дар'і Цітовай — добра знаёмыя ёй мясціны Калінкавіцкага раёна, сучасная Гомельшчына. Некаторым можа падацца: дык і тут нам прапаноўваюць здзейсніць падарожжа ў мінулае. Але ж не. Вулкі, здаецца, паўзанядбанай вёсачкі, маляўнічыя ваколіцы, буянства прыроды — апісанне сучаснай беларускай вёскі, у які куток Беларусі ні завітай. Не заўсёды пазнавальнасць ідзе на карысць твору, але ў дадзеным выпадку яна падаецца да месца. Погляд маладой мастачкі на, здаецца, нічым не адметныя мясціны, яе шчырае замілаванне традыцыйным мастацтвам падкупляе.


*Работы Дар'і Цітовай.*

— Мне цікава тое, што навокал, — а сельская мясцовасць побач, — адзначае Дар'я Цітова. — Аддаю перавагу гуашы, бо падабаецца яе колеравая насычанасць, цаню яе і за хуткасць выканання. Адсюль і маленькі фармат — хочацца паспець зрабіць болей. Да таго ж і ўражанне ад вокамгнення лепей перадаецца ў малых формах. Вялікія вымагаюць больш карпатлівай працы, прадуманасці, кампазіцыйнай завершанасці… Эцюд у гэтым плане непатрабавальны, але вынік таксама здольны ўразіць.

Выстаўка «Малая радзіма ў творчасці беларускіх мастакоў» у Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна экспануецца да 15 снежня на другім паверсе. Уваход вольны.

**Яўгенія ШЫЦЬКА,**
**фота аўтара**